Фарпост спакою

# РАЎНЕННЕ НА ПОДЗВІГ



**Дні і ночы нясуць адказную службу падраздзяленні органаў унутраных спраў. Імёнамі супрацоўнікаў, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у барацьбу супраць злачыннасці і ва ўмацаванне правапарадку, вырашана назваць пераходныя прызы ГУУС Мінгарвыканкама. Узнагароды будуць прысуджацца найлепшым падраздзяленням па выніках іх аператыўна-службовай дзейнасці за год.**






На прэзентацыю гэтых прызоў у будынак гістарычнай мінскай ратушы сабраліся ветэраны органаў унутраных спраў, дзеючыя супрацоўнікі, кіраўніцтва мінскай міліцыі. Запрасілі сюды таксама родных праслаўленых ахоўнікаў парадку. Адкрываючы прэзентацыю, **начальнік ГУУС Мінгарвыканкама генерал-маёр міліцыі Іван Кубракоў** адзначыў: **«Сёння мы аддаём даніну глыбокай удзячнасці і павагі людзям, якія зрабілі вялікі асабісты ўнёсак у барацьбу са злачыннасцю і ўмацаванне правапарадку ў нашым горадзе. На прыкладах бездакорнага выканання службовых абавязкаў і подзвігаў нашых калег мы павінны выхоўваць новыя пакаленні мінскіх праваахоўнікаў».**



Побач з дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь і сцягам беларускай сталіцы былі выстаўлены шэсць прызоў з чырвонага граніту і металу. Пра тых, чыімі імёнамі названыя гэтыя ўзнагароды, расказалі кадры дакументальнага фільма, які быў паказаны ўдзельнікам прэзентацыі. З кароткім экскурсам у мінулае былі прадстаўленыя іх біяграфіі. На экране ажылі падзеі далёкіх дзесяцігоддзяў і нядаўніх часоў.



Першае было названа імя **генерал-лейтэнанта ўнутранай службы Віктара ПІСКАРОВА.** Яго працоўная біяграфія пачалася ў 1945 годзе. Ад маладога рабочага да Міністра ўнутраных спраў БССР, вядомага грамадскага дзеяча — такі шлях быў пройдзены Віктарам Піскаровым. Пад яго кіраўніцтвам у свой час былі ўкаранёны новыя эфектыўныя формы аховы правапарадку. У тыя гады мінскую міліцыю заслужана лічылі базавым органам у сістэме МУС СССР. Галоўны прыз імя В. Піскарова будзе прысуджаны найлепшаму падраздзяленню сталічнай міліцыі.

**Палкоўнік міліцыі Уладзімір СВІРЫДАЎ** (у яго гонар названы прыз для найлепшага падраздзялення крымінальнага вышуку) змагаўся на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскіх атрадах, кіраваў дыверсійна-падрыўной групай. У мінскім падполлі разам з бацькам ён дапамагаў выпускаць газету «Звязда».

**Падпалкоўнік міліцыі Уладзімір ЛЕВАЦЕНКА** (у яго гонар названы прыз для найлепшага падраздзялення аховы грамадскага парадку і прафілактыкі) быў у час службы адзіны сярод мінскіх участковых інспектараў узнагароджаны найвышэйшай дзяржаўнай узнагародай — ордэнам Леніна. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ён мужна дзейнічаў у самых экстрэмальных сітуацыях.

**Палкоўнік міліцыі Анатоль СІДАРЭНЯ** (у яго гонар названы прыз для найлепшага падраздзялення ДАІ) неадночы быў адзначаны за асабістую храбрасць і самаадданасць пры выкананні службовых абавязкаў. Адным з самых складаных заданняў было кіраўніцтва зводным атрадам сталічнай міліцыі падчас ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

**Старшына міліцыі Уладзімір ГОВЕН** (у яго гонар названы прыз найлепшаму падраздзяленню атрада міліцыі асобага прызначэння) у 1999 годзе апынуўся ў эпіцэнтры трагічных падзей на Нямізе. Ён загінуў, ратуючы ў падземным пераходзе захопленых смяротнай цісканінай людзей. Ордэнам «За асабістую мужнасць» дваццацічатырохгадовы старшына быў узнагароджаны пасмяротна.

**Прапаршчык міліцыі Ігар ІВАНЧЫК** (у яго гонар названы прыз найлепшаму патрульнаму падраздзяленню) разам з саслужыўцамі быў тэрмінова накіраваны на затрыманне невядомага мужчыны, у якога знаходзілася рэч, падобная на пісталет. Зброя злачынцы спрацавала нечакана. Прапаршчык загінуў пры затрыманні. Ордэнам «За асабістую мужнасць» пасмяротна адзначаны яго выключная адвага і вернасць службоваму абавязку.

Настаяцель аднаго з мінскіх прыходаў **протаіерэй ДЗІЯНІСІЙ,** акрапляючы прызы ў гонар герояў — вартавых правапарадку, нагадаў біблейскія радкі пра тое, што няма большай любові, калі хто аддасць жыццё сваё за сяброў сваіх. Мудрасць, заключаная ў гэтых словах, актуальная і ў нашы часы.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**

Чытач — газета

# «Ты адно запомні, браце, са «Звяздой» — цяплей у хаце!»

**Каб пераканацца, што госць сышоў (у кожным жарце ёсць доля жарту...), трэба «спусціць» яго з лесвіцы — то-бок праводзіць. Каб паспадзявацца, што госць прыйдзе (у тым ліку ў рэдакцыю), трэба як мінімум яго запрасіць. Балазе што і нагоды часам з'яўляюцца: ну, у прыватнасці, па выніках кожнай падпісной кампаніі газета «Звязда» праводзіць традыцыйны розыгрыш прызоў. Гэтым разам сярод іх былі ўтульныя пледы з лагатыпам нашага выдання і кававарка — рэчы ў гаспадарцы зусім не лішнія, асабліва — для зімы (нават такой, як сёлета).**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Хто ж вырашаў іх лёс і як праходзіў сам розыгрыш?

Даўнім чытачам расказваць пра гэта не трэба. Ды і нядаўнім — таксама. Такім чынам кожны, хто аформіў падпіску на «Звязду» на першы квартал альбо першае паўгоддзе 2020-га і, скажам так, хацеў бы займець адзін з прызоў, мог запоўніць невялічкую картку-купон (яны друкаваліся і падчас новай падпісной кампаніі будуць друкавацца па пятніцах разам з праграмай тэлеперадач) і даслаць яго на адрас газеты. Тут, у рэдакцыі, усе атрыманыя карткі рэгістраваліся і сартаваліся, каб потым, у дзень розыгрышу, «прайсці» праз наш чароўны капялюш, прычым — у пэўным парадку. Гэта значыць, спачатку ў яго складваюцца ўсе карткі, атрыманыя з Брэсцкай вобласці, — выцягваецца адна шчаслівая, потым з Віцебскай... З Гомельскай... А нарэшце — з усіх абласцей і сталіцы, каб даведацца імя ўладальніка суперпрыза.

Якраз гэту вось адказную работу рэдакцыя па традыцыі даручае гасцям: дзелавым партнёрам газеты, яе падпісчыкам. Надоечы сярод іх былі **інжынер упраўлення распаўсюджання друку РУП «Белпошта» Таццяна Іванаўна УСЕВІЧ,** а таксама адданыя падпісчыцы газеты Таццяна Віктараўна Камчыц, Алена Іосіфаўна Шуцько і Таццяна Уладзіміраўна Гаральчук *(на здымку)*.

Як заўважылі, усе жанчыны. Мо таму (жаночую салідарнасць ніхто не адмяняў?) і прызы яны выцягнулі менавіта для жанчын. Такім чынам...

**Пледы двухбаковыя колеру бардо з лагатыпам Выдавецкага дома «Звязда» выйгралі:**

**Алена Іосіфаўна ДАШЭВІЧ, вёска Серадова Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці;**

**Раіса Аляксееўна АСТАШОНАК, аграгарадок Шпакоўшчына Полацкага раёна Віцебскай вобласці;**

**Жанна Васілеўна САКАВЕЦ, аграгарадок Мілашавічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці;**

**Эмілія Пракопаўна МАЛАШАНКА, аграгарадок Масты Правыя Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці;**

**Ірына Леанідаўна ЛЫСЕЎСКАЯ, горад Горкі Магілёўскай вобласці;**

**Леакадзія Канстанцінаўна БАЛАШКА, горад Валожын Мінскай вобласці;**

**Эма Іванаўна ВАСІЛЕВІЧ, горад Мінск.**

**Суперпрыз — кававарку эспрэса Vitek VT-1514 — выйграла Галіна Станіславаўна САРАГАВЕЦ, горад Мінск.**

Віншуем!

Што сказаць тым, каму гэтым разам (альбо зноў) удача не ўсміхнулася?

Хіба адно: не варта засмучацца, бо вы не выйгралі, але ж, спадзяёмся, нічога і не прайгралі. Ва ўсякім разе, да вас пяць разоў на тыдзень будзе прыходзіць родная газета на роднай мове — каб інфармаваць, прасвятляць, дапамагаць парадамі, каб часам забаўляць і... дарыць надзею, бо рэдакцыя зноў выбірае прызы. Якія? Пажывём — разыграем.

Афіцыйна:

арганізатарам рэкламнай гульні «Звязда» сагравае!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013.

Рэкламная гульня «Звязда» сагравае!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 26.11.2019 года (пасведчанне № 3694) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 снежня 2019 года да 31 сакавіка 2020 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2020 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 156 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

*Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў 8 (017) 263-66-73.*